• ПІНСК

## Веладэфіле для дзяўчат

Сем навучэнак розных пінскіх вучэбных устаноў удзельнічалі ў конкурсе "ВелаВосень-2016", арганізаваным гарадскім камітэтам ГА "БРСМ". "Візітная картка", "Веладэфіле", "Фігурнае ваджэнне", "Бяспечнае кола", "Самы стыльны жаночы веласіпед", "Самы арыгінальны стыль" – ва ўсіх гэтых частках конкурсу патрабаваліся творчы падыход удзельніц, дакладнасць выканання элементаў і арыгінальнасць ідэі. Усяго гэтага хапіла студэнтцы Палескага дзяржуніверсітэта Марыне Калесніковіч, якая стала пераможцай.

**Народная трыбуна. – 2016. - № 44 (1343). – 28 кастрычніка. – С. 9**

РАВЕСНІК

СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК **ДЛЯ МОЛАДЗІ** • №22 (458)

НАДЗЕЯ БЕЛАЙ РУСІ

# ТАЛЕНТ і крэатыўнасць

*Напрыканцы мінулага тыдня ў Пінску адбыўся абласны этап VI рэспубліканскага конкурсу "Студэнт года"*



Праводзілі яго на базе Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта. І невыпадкова, бо студэнтка гэтай установы адукацыі Аляксандра Барысенка была пераможцай мінулагодняга абласнога этапа конкурсу. А сам конкурс, дарэчы, накіраваны на развіццё студэнцкіх ініцыятыў і праектаў, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі моладзі ў галінах грамадскай дзейнасці, навукі, мастацтва і спорту, стымуляванне лідарскіх якасцей, павышэнне прэстыжу ведаў і папулярызацыю прафесіі.

Арганізатарамі гэтай маштабнай у жыцці студэнтаў вобласці восеньскай дзеі выступілі абласны камітэт ГА "БРСМ" і галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама пры падтрымцы ўстаноў вышэйшай адукацыі Берасцейшчыны. Дарэчы, іх прадстаўнікі ўваходзілі ў склад кампетэнтнага журы, якое ўзначальваў першы сакратар абласнога камітэта грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі" Віктар Іваноў.

Вялікая актавая зала ўніверсітэта была запоўнена студэнтамі-балельшчыкамі кожнага з чатырох удзельнікаў спаборніцтваў. Групы іх падтрымкі раз-пораз скандзіравалі імёны фіналістаў. Вабішчэвіч (Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна), Анастасія Лукашэвіч (Палескі дзяржаўны ўніверсітэт) і Раман Шухно (Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт). Яны былі выбраны з некалькіх тысяч студэнтаў.

Заўважу, не кожны малады чалавек мае дасягненні, якія ў паслужным спісе фіналістаў. Тая ж Карына Цялюшчанка ***(на здымку)*** сумяшчае вучобу з грамадскай і навуковай дзейнасцю: удзельнічае ў харавым акадэмічным калектыве "Белая вежа", у калектыве эстраднага танца "Эдэльвейс" і народнага танца "Крутуха".

Раман Шухно – староста групы, удзельнік інтэлектуальна-творчага аб'яднання ўніверсітэта "Школа лідара "Творчы актывіст XXI стагоддзя", старшыня каардынацыйнага савета лідараў студэнцкага самакіравання.

Мікалай Вабішчэвіч – лаўрэат дыплома І ступені рэспубліканскага фестывалю мастацкай творчасці навучэнскай і студэнцкай моладзі "Арт-вакацыі", намінант рэспубліканскага конкурсу літаратурнай творчасці студэнтаў "Аўтограф", фіналіст конкурсу "Новыя імёны Беларусі-2016".

І, нарэшце, Анастасія Лукашэвіч. Не адзін год з'яўляецца членам грамадскага рэспубліканскага студэнцкага

Дарэчы, усе фіналісты – студэнты 4-га курса.

Напачатку кожны з іх прадставіў на суд журы і гледачоў відэаролік для конкурсу самапрэзентацыі "Я – студэнт!". Інтэлектуальны конкурс "Мая краіна – Беларусь!" патрабаваў хуткіх і дакладных адказаў, напрыклад, на такія пытанні: "Вашы рэформы ў сістэме адукацыі, калі б вас назначылі міністрам адукацыі"; "Інавацыі ў жыцці студэнтаў, калі б вы былі рэктарам універсітэта"; "Тэзісы вашай праграмы як кандыдата ў дэпутаты" і іншыя. Адказы фіналістаў былі грунтоўнымі і выклікалі дружныя апладысменты залы. Як, між іншым, і прэзентацыі кніг "Крыніцы мудрасці". Гэты конкурс патрабаваў прэзентаваць адзін з беларускіх літаратурных твораў.

А фінальны конкурс "Беларусь культурная" дэманстраваў талент і ўменне канкурсантаў. Як адзначыў напрыканцы Віктар Іваноў, сёлетні конкурс вызначыўся сваім патрыятычным накірункам: гаварылі і спявалі на беларускай мове, а літаратурныя творы і песні былі

аздаблялі праграм

Кожны фінал
звання перамож
тэнтнае журы д
інтрыгу. Спача
раможцу ў нам
ONLINE" – Кары
карыстальнікі са
прагаласавалі за
самапрэзентацы
асобай" стаў Мік
У намінацыі "За в
вызначыўся Ра
намінацыі "За ў
вобраз" – Анаст

І вось старшы
імя пераможцы –
чанка з Брэсцка
тэхнічнага ўнівер
такое дасягне
ўпершыню ў гіс
вучальнай устан
будзе прадстаўл
чыну ў фінале р
конкурсу. Спа
поспех. І маем
гэтага: у 2014
цай стала нац
ская, удзельні
Баранавіцкага
ўніверсітэта Ал